# Скарынаўскі год – юбілейны!




**Сёлета спаўняецца 500 гадоў, як Францыск Скарына надрукаваў першы экземпляр Псалтыра ў беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы, паклаўшы пачатак айчыннаму кнігадрукаванню.**

Стр. 2

Францыска Скарыну можна смела лічыць Чалавекам Свету, бо ён зрабіў вялікі ўклад у развіццё еўрапейскай культуры, аб'яднаў сваёй працай многія гарады і краіны. Таму не выпадкова, што ў час святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання будзе прадстаўлена шмат міжнародных праектаў.

У дзіцячай бібліятэцы г. Ельска падрыхтавана кніжная выстава, прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Па словах Святланы Хіжняковай *(на здымку)*, дзеці з цікавасцю знаёмяцца з кнігамі, удзельнічаюць у віктарыне, якая дае магчымасць больш даведацца пра жыццё і дзейнасць славутага беларуса Францыска Скарыну з Полацку, які стаў знакамітым ва ўсім свеце, праслаўляючы Белую Русь.

Гэты юбілей – не толькі гісторыя беларускага кнігадрукавання, але і сусветная кніжная гісторыя, гісторыя сусветнай кніжнай культуры, лічыць Лілія Ананіч, Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пра Скарыну будуць расказваць нашы суайчыннікі, праводзячы Дні беларускай культуры ў розных краінах. На яго дзейнасць звернуць увагу госці з іншых дзяржаў, якія завітаюць да нас на канферэнцыі, выстаўкі, сімпозіумы. Да шырокага святкавання далучацца беларускія выдаўцы, мастакі, тэатралы, музейшчыкі.

# Скарынаўскі год – юбілейны!

Так, у час пасяджэння рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, што прайшло ў Нацыянальнай бібліятэцы, быў абмеркаваны план святочных мерапрыемстваў, які ўключае каля шасці дзясяткаў пунктаў і закранае фактычна ўсе сферы грамадскага і культурнага жыцця краіны.

Лілія Ананіч адзначыла, што 500-годдзе выдання Францыскам Скарынам Псалтыра будзе шырока адзначацца ва ўсім свеце, у тым ліку па лініі ЮНЕСКА. На прасторы Садружнасці мерапрыемствы пройдуць пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў – удзельніц СНД. У нас у краіне пачалася ўжо і вядзецца маштабная работа па падрыхтоўцы да такога знакавага юбілею. Гэта і скарынаўскія праекты, якія былі прадстаўлены на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, і Дзень беларускага пісьменства, што рыхтуецца, і тэматычныя праекты Нацыянальнай бібліятэкі, і шэраг іншых культурных праектаў. Свята атрымала свой стылёвы лагатып, пра яго будуць нагадваць і спецыяльна распрацаваныя плакаты, якія размесцяцца ў кнігарнях, кіёсках "Белсаюздруку", бібліятэках.

**Яна ІВАНОВА**

